Представленные программы являются результатом качественного переосмысления общих целей и конкретных задач обучения математики, продиктованного современными требованиями к начальному математическому образованию.

Таким образом, сравнительный анализ методических подходов к изучению величины площадь по предложенным программам позволяет выделить интересные и эффективные формы и методы работы, которые можно (при определенных условиях) использовать в рамках работы по иным программам.

УДК 372.881.1

## ТЭОРЫЮ АРФАГРАФІІ Ў ПРАКТЫКУ

**Н. М. Антановіч**
*УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», г. Мінск, Беларусь, e-mail: antonovich_nm@bspu.by*

**А. М. Івакіна**
*ДУА «Сярэдняя школа № 153 г. Мінска», г. Мінск, Беларусь*

**В. Г. Качан**
*УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», г. Мінск, Беларусь, e-mail: antonovich_nm@bspu.by*

У артыкуле раскрываюцца асаблівасці ўкаранення і апрабацыі комплекснай методыкі навучання беларускай арфаграфіі на базе філіяла кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі БДПУ.

*Ключавыя словы:* навучанне беларускай арфаграфіі, комплексная методыка, вучні пачатковых класаў, філіял кафедры беларускага і рускага мовазнаўства.

На I ступені агульнай сярэдняй адукацыі ў вучняў фарміруецца адносная арфаграфічная пісьменнасць – «уменне пісаць словы ў адпаведнасці з вывучанымі ў школе арфаграфічнымі правіламі, уключаючы словы з неправяраемымі арфаграмамі, засвоенымі па пэўным спісе» [1, с. 149].

На працягу 2017–2020 гг. на базе філіяла кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі БДПУ, у ДУА «Сярэдняя школа № 153 г. Мінска», у межах праекта «Асаблівасці фарміравання моўнай сістэмы навучэнца білінгва I ступені атрымання агульнай сярэдняй адукацыі» ўкаранялася комплексная методыка навучання беларускай арфаграфіі ў пачатковых класах, распрацаваная Н. М. Антановіч. Актуальнасць праблемы выпрацоўкі арфаграфічнай пісьменнасці на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі ва ўмовах афіцыйнага блізкароднаснага руска-беларускага двухмоўя бясспрэчная і вызначаецца не толькі неабходнасцю пошуку эфектыўных метадаў і прыёмаў навучання, але і вырашэння пытання адбору зместу і арганізацыі працэсу засваення ведаў вучнямі.

Арфаграфічны навык, як і любы іншы навык, выпрацоўваецца ў працэсе шматразовага выканання практыкаванняў. Сістэма практыкаванняў павінна прадугледжваць бесперапыннасць трэніровачнай работы, паступовае ўдасканаленне самастойнасці вучняў у працэсе іх выканання, ускладненне характару заданняў, пашырэнне агульнамаўленчай накіраванасці практыкаванняў, садзейнічаць маўленчаму і інтэлектуальнаму развіццю вучняў. З мэтай эфектыўнага навучання арфаграфіі неабходна выкарыстоўваць рознаўзроўневыя фанетыка-арфаграфічныя, марфеміка-арфаграфічныя, граматыка-арфаграфічныя практыкаванні, распрацаваныя з улікам этапаў фарміравання арфаграфічнага навыку [2].

Вынікі даследаванняў псіхолагаў сведчаць аб тым, што фарміраванне арфаграфічнага навыку на першапачатковым этапе суправаджаецца інтэнсіўнай разумовай дзейнасцю. У гэты перыяд ёсць магчымасць кіраваць разумовымі аперацыямі, якія ў значнай меры забяспечаць выпрацоўку навыку. Важным этапам з'яўляецца асэнсаванне арфаграфічнага дзеяння, дасягнуць гэтага можна ў працэсе засваення сістэмы прадпісанняў па выкарыстанні правіла. У сувязі з гэтым у якасці аднаго з эфектыўных метадаў навучання арфаграфіі называюць алгарытмізацыю. Выкарыстоўваць алгарытмы пры навучанні арфаграфіі мэтазгодна ўжо на I ступені атрымання агульнай сярэдняй адукацыі, паколькі «ўжо ў пачатковых класах дзеці з поспехам могуць карыстацца схемамі дзеянняў, калі яны дастаткова простыя і праведзена неабходная падрыхтоўчая работа» [3, с.150]. Падчас прымянення алгарытмаў мабілізуюцца слых, зрокавая памяць, кінестэзічныя адчуванні, адбываецца арганізацыя разумовай дзейнасці вучняў. Выкарыстанне алгарытмаў, прапанаваных Н. М. Антановіч, спрыяе фарміраванню ўмення свядома выкарыстоўваць арфаграфічныя правілы на пісьме (дапаможнік «Правілы беларускай мовы ў алгарытмах і схемах : 2–4 класы»).

Настаўнікі пачатковых класаў ДУА «Сярэдняя школа № 153 г. Мінска», удзельнікі навукова-даследчай лабараторыі «Ад слова да фразавага маўлення» В. Л. Забаўская, А. П. Цывінская, Л. У. Каражнова, прымянялі рознаўзроўневыя фанетыка-арфаграфічныя, марфеміка-арфаграфічныя, граматыка-арфаграфічныя практыкаванні, распрацаваныя Н. М. Антановіч (дапаможнікі «Навучанне арфаграфіі ў пачатковых класах» (аўтар Н. М. Антановіч), «Дыктанты і спісванні па беларускай мове: 2–4 класы» (аўтары Н. М. Антановіч, Н. У. Антонава)).

Падчас эксперыментальнага навучання асаблівая ўвага надавалася засваенню правапісу слоў з неправяраемымі арфаграмамі (слоўнікавых слоў). У працэсе работы са слоўнікавымі словамі выкарыстоўваўся сенсаматорны метад, які прадугледжвае актыўную дзейнасць слыхавой, зрокавай і рухальнай (маўленчарухальнай і рукарухальнай) памяці [2]. На ўроках беларускай мовы настаўнікі прымянялі разнастайныя прыёмы, праз якія рэалізуецца сенсаматорны метад: пакладовае арфаграфічнае прагаворванне, шматразовы запіс слова (прымяняліся разнастайныя па змесце практыкаванні), прыёмы, заснаваныя на мнематэхніцы, і інш.

Праца з кожным слоўнікавым словам не абмяжоўвалася адным урокам. Рэгулярна на ўроках беларускай мовы і ў пазавучэбнай дзейнасці настаўнікі прапаноўвалі вучням для выканання заданні з вучэбных дапаможнікаў «Слоўнікавыя словы: рабочы сшытак. 2 клас», «Слоўнікавыя словы: рабочы сшытак. 3 клас», «Слоўнікавыя словы: рабочы сшытак. 4 клас» (аўтары Н. М. Антановіч, В. І. Свірыдзенка). Варта адзначыць, што прадстаўленыя ў дапаможніках практыкаванні садзейнічалі не толькі паслядоўнаму засваенню і замацаванню правапісу слоўнікавых слоў, але і ўзбагачэнню слоўнікавага запасу малодшых школьнікаў, развіццю іх творчых здольнасцей.

Асаблівую цікавасць у вучняў пры вывучэнні слоўнікавых слоў выклікалі малюнкі-апоры, якія, у першую чаргу, садзейнічаюць актывізацыі зрокавай памяці. Пры знаёмстве са слоўнікавымі словамі настаўнікі прад'яўлялі гатовыя зрокавыя апоры (каляровая ўкладка да часопіса «Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа» з № 2 2018 г. па № 12 2018 г., з № 1 2019 г. па № 9 2019 г.). Некаторыя вучні актыўна ўключаліся ў творчы працэс і прапаноўвалі свае варыянты магчымых малюнкаў на месцы неправяраемых арфаграм у словах.

Паколькі сёння актуальным і запатрабаваным з'яўляецца прымяненне электронных сродкаў навучання, былі выкарыстаны распрацаваныя Н. М. Антановіч інтэрактыўныя гульні-трэнажоры па тэмах арфаграфіі, вывучэнне якіх прадугледжана ў пачатковых класах (мультымедыйны дадатак да часопіса «Пачатковая школа»), а таксама электронны адукацыйны рэсурс па арфаграфіі (https://e-vedy.adu.by). Электронныя сродкі навучання настаўнікі прымянялі, як правіла, у пазаўрочны час з мэтай арганізацыі індывідуалізацыі і дыферэнцыяцыі навучання.

Такім чынам, у працэсе эксперыментальнага навучання былі ўкаранены і апрабаваны комплекс метадаў навучання арфаграфіі (сістэма арфаграфічных практыкаванняў (фанетыка-арфаграфічных, марфеміка-арфаграфічных, граматыка-арфаграфічных); і алгарытмізацыя як аперацыйна-лагічны метад, які садзейнічае разуменню арфаграфічнага матэрыялу, фарміраванню ўмення выкарыстоўваць арфаграфічныя правілы на пісьме; і сенсаматорны метад з апорай на мнематэхніку для засваення правапісу слоўнікавых слоў; і сучасныя электронныя адукацыйныя рэсурсы (электронныя даведачна-інфармацыйны, трэніруючы, кантрольна-дыягнастычны, інтэрактыўны модулі, размешчаныя на платформе Moodle); і электронныя арфаграфічныя гульні-трэнажоры. Вучэбна-метадычнае забеспячэнне эксперыментальнага навучання ажыццяўлялася вучэбнымі матэрыяламі для вучняў і метадычнымі рэкамендацыямі для настаўнікаў.

У эксперыментальным навучанні прымалі ўдзел 78 вучняў пачатковых класаў. Кантрольны зрэз на выяўленне эфектыўнасці распрацаванай методыкі навучання арфаграфіі на І ступені атрымання агульнай сярэдняй адукацыі ўтрымліваў наступныя заданні: кантрольны дыктант, дыктант са словазлучэнняў, пераказ, пераклад, заданне на знаходжанне і выпраўленне памылак. Вызначэнне ўзроўню сфарміраванасці арфаграфічнай пісьменнасці вучняў

па кожным заданні адбывалася ў адпаведнасці з нарматыўнымі дакументамі, зацверджанымі Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Вынікі аналізу сукупнасці дыягнастычных заданняў дазволілі зрабіць вывад аб эфектыўнасці прадстаўленай комплекснай методыкі навучання арфаграфіі, належным узроўні арфаграфічнай пісьменнасці вучняў эксперыментальных класаў на этапе заканчэння пачатковай школы.

### Спіс выкарыстаных крыніц


1. Методика преподавания русского языка в школе : учеб. для студ. высш. пед. учеб. заведений / М. Т. Баранов [и др.] ; под ред. М. Т. Баранова. – М. : Изд. центр “Академия”, 2000. – 368 с.
2. Антановіч, Н. М. Навучанне арфаграфіі ў пачатковых класах : вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання / Н. М. Антановіч. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2015. – 206 с.
3. Власенков, А. И. Обучение русской орфографии, 5 – 11 классы: для школ с белорусским языком обучения / А. И. Власенков. – 2-е изд., перераб. и доп. – Минск : Народная асвета, 1992. – 222 с.


УДК 372.882

## ПРАЦА НАД МАСТАЦКІМ ТВОРАМ ВА ЎМОВАХ ДЫСТАНЦЫЙНАГА НАВУЧАННЯ

**Н. У. Антонава**

*Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, г. Мінск, Беларусь, e-mail: nadejaantonova@mail.ru*

У артыкуле разглядаецца варыянт распрацоўкі зместу працы з літаратурным творам на дыстанцыйных занятках літаратурнага чытання. Паказана магчымая трансфармацыя класічнай методыкі працы з літаратурным творам ва ўмовах апасродкаванай самастойнай працы вучня з захаваннем навучальнага і развіццёвага эфектаў дзейнасці з мастацкім творам.

*Ключавыя словы:* літаратурнае чытанне, методыка працы з мастацкім творам, дыстанцыйнае навучанне.

У адпаведнасці з даручэннем Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь была ажыццёўлена распрацоўка матэрыялаў Адзінага інфармацыйна-адукацыйнага рэсурса для арганізацыі дыстанцыйнага навучання вучняў, якія не могуць наведваць установу адукацыі. Для навучання літаратурнаму чытанню пастаўленую задачу неабходна было выканаць з улікам наступных умоў: апасродкаваная (без кантролю настаўніка) дзейнасць вучня з творам, арганізацыя самакантролю дзейнасці вучня ў працэсе працы з творам, дакладны